УДК 81'373.23

Студ. К.С. Сычык
Навук. кір. дацэнт А.А. Кірдун
(кафедра беларускай філалогіі, БДТУ)

# НАЗВЫ АСОБ У ДЫЯЛЕКТНЫМ СЛОЎНІКУ ВЁСКІ ЗДЗІТАВА

Дыялектная мова з'яўляецца невычэрпнай крыніцай ведаў аб значэнні слоў літаратурнай мовы, гісторыі нашага краю, духоўных набытках людзей. Разам з тым, у наш час, калі імкліва адбываюцца працэсы ўрбанізацыі і глабалізацыі, дыялектныя рысы ў маўленні насельніцтва пастулова сціраюцца, а таму існуе пільная неабходнасць паспець зафіксаваць тое самабытнае, спадчыннае, што яшчэ можа нам перадаць старэйшае пакаленне.

Мэта даследавання – выяўленне асаблівасцей намінацыі асоб у дыялектным слоўніку маёй роднай вёскі Здзітава, самага старажытнага паселішча ў Бярозаўскім раёне Брэсцкай вобласці. Моўны матэрыял для ўзгаданага слоўніка збіраўся вучнямі Здзітаўскай школы на працягу дзесяці гадоў, з 2008 па 2018 год. Рэспандэнтамі сталі жыхары Здзітава ва ўзросце ад шасці да дзевяноста шасці гадоў, усяго каля 50 чалавек.

Трэба адзначыць, што мова нашай вёскі адносіцца да заходнепалескіх, ці брэсцка-пінскіх гаворак, якія вылучаюцца сярод іншых беларускіх гаворак вельмі спецыфічнымі рысамі. "У іх многа агульнага з украінскай мовай, што дае падставы вучоным называць Палессе своеасаблівым этна-культурна-моўным мастом паміж беларускім і ўкраінскім народамі. Так, палескай групе гаворак уласціва <u>оканне</u> (*в<u>о</u>д<u>а</u>, н<u>о</u>г<u>а</u>*), цвёрдыя зычныя (*вэчор,зыма*), вымаўленне **[і]** на месцы **ѣ** (*ліс*, *хліб*); спалучэнне **[мн']** перад **[а]**: *мнята, мнясо*; канчатак ***-ові*** ў Д. і М. склонах (*братові, сынові*); інфінітыў на ***–ты*** (*ходыты, купыты*); зычны **[л]** у дзеясловах 3-й асобы мн. ліку з асновай на губны (*лоўлять, куплять*) і інш." [1].

Словы, што трапілі ў слоўнік, абазначаюць традыцыйныя заняткі жыхароў вёскі (земляробчая і жывёлагадоўчая лексіка), самаробныя бытавыя і гаспадарчыя прадметы, з'явы прыроды, прадметы адзення, ўпрыгожанні і г. д. Асаблівае месца займаюць эмацыянальна-ацэначныя назвы асоб, якія "змяшчаюць інфармацыю аб суб'ектыўным адлюстраванні аб'ектыўнага свету і эмацыянальных адносінах утваральніка маўлення да прадмета гаворкі. У аснове працэсу кваліфікацыі – параўнанне аб'екта з пэўным эталонам, прынятым у грамадстве. Такое суаднясенне непазбежна прыводзіць да

ўзнікнення суб'ектыўнай ацэнкі – станоўчай або адмоўнай" [2]. Эмацыянальна-ацэначныя назвы асоб падзяляюцца на падгрупы:

назвы паводле фізічнай недасканаласці са значэннямі 'малы, недарослы' (*капшу́к, куроп'я́* (ад *курапа́тка*)*, корна́тый, карапу́з, куза́ка* (ад *казя́ўка*)*, мызэ́рна, карду́пэль, шмакодя́ўка*), 'хваравіты, кволы' (*худоба́, здыхля, пудтя́глы, бракі́ўна, доходя́га*), 'кульгавы' (*клэ́ўша, ку́льба, косола́пы, крывола́пы*);

назвы паводле знешняга выгляду са значэннямі 'неахайны' (*замара́ха, заглымэ́зда, кучмэ́ра, шму́йло, шкара́нда, опу́дына, расшоло́па, ныо́прат, слы́нява, котлома́з, пэ́лё* і інш.), 'занадта высокі' (*огло́бля, ды́лда, сталю́га, бадзыго́й, дзігна́ты* і інш.), 'занадта тоўсы ці худы' (*сту́па, то́рба, ошча́пна, пранцорэ́бра, брыль*);

назвы паводле разумовых здольнасцей са значэннямі 'някемлівы' (*доўбэ́шка, обу́х, олу́х, остоло́п, бо́лес* і інш.), 'няўважлівы' (*роззя́ўрот, росшоло́па*);

назвы паводле паводзін са значэннямі 'фанабэрысты' (*зух, мо́ндра, фанабэ́рыя, норовы́сты*), 'хітры, пранырлівы' (*ці́тра, чыпі́рка, проы́ра, проя́ва, процу́да, круті́ль, ша́хворост, гі́цэль, нышпа́рка, шы́мэль, попэры́дня, одо́рва*), 'надаедлівы' (*е́нта, здзя́га, слота́, нэ́тра, впы́ха, скны́ра, нэ́ндза, рэ́вза*), 'які неабдумана шмат гаворыць' (*лыпыту́н, шы́вэра, тара́нда, брыху́н, трэ́пачка, болботу́ха*), 'які не трымаецца дому' (*смы́кса*);

назвы паводле якасцей характару са значэннямі 'сквапны' (*зазро́на, скны́ра*), 'хлуслівы' (*мутю́н, брыху́н, крутю́н*), 'наравісты' (*упэ́ртюх*).

Як можна меркаваць па прыведзеных прыкладах, жыхары вёскі Здзітава праяўляюць стрыманасць у ацэнцы знешне прыгожых і фізічна здаровых людзей. Адзінак, праз якія выяўляюцца адмоўныя адносіны да чалавека, што не адпавядае народным уяўленням пра знешнюю і фізічную прыгажосць, дасканаласць, значна больш. У слоўніку налічваецца 108 лексічных адзінак з адмоўнай канатацыяй, і толькі 3 словы *лыпытун́, болботу́ха, крутю́н* могуць мець у маўленні станоўчую канатацыю ў дачыненні да маленькіх дзяцей.

ЛІТАРАТУРА

1. Дуброўскі, А.У. Сучасная беларуская мова [Электронны рэсурс]. / А.У. Дуброўскі – Рэжым доступу: https://urok.shkola.of.by/a-u-dubroski-suchasnaya-belaruskaya-mova.html?page=6 (дата доступу: 04.03.2021).

2. Урбан, В.В. Катэгорыя ацэнкі ў беларускай дыялектнай мове (на матэрыяле субстантываў – характарыстык асобы) : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10.02.01 / В.В. Урбан; УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка". – Мінск, 2002. – 21 с.